*Г. М. Стэльмах*

**АСАБЛІВАСЦІ СІСТЭМЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ СУБ'ЕКТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ АНТРЭПРЫЗЫ**
**(па матэрыялах сацыялагічнага даследавання)**

Адраджэнне тэатральнай антрэпрызы ў 90-я гг. XX ст. з'явілася прамым адлюстраваннем сацыякультурных працэсаў гэтага часу. Змяншэнне бюджэтнага фінансавання тэатральнай сферы і прыцягненне прыватных сродкаў, спрашчэнне сістэмы кіравання тэатральным працэсам, які быў падкантрольны дзяржаўна-ўладным органам, адкрыла новыя перспектывы творчасці перад сцэнічнымі дзеячамі, магчымасці рэалізацыі арыгінальных рэжысёрскіх ідэй. З мэтай вылучэння ролі прыватных праектаў у крэатыўнай прасторы сучаснага беларускага тэатра, аўтарам праводзілася шырокамаштабнае даследаванне (2006), якое ахапіла суб'ектаў тэатральнага працэсу (акцёраў і рэжысёраў, што працуюць у тэатральнай антрэпрызе) і непасрэдных спажыўцоў канчатковага прадукту сцэнічнай дзейнасці (тэатральных крытыкаў і аўдыторыі гледачоў).

На завяршальным этапе правядзення сацыялагічнага даследавання для адлюстравання цэласнай карціны функцыянавання антрэпрызы (1997–2007), былі апытаны рэспандэнты з ліку вядучых дзеячаў беларускай сцэны, найболей запатрабаваных у рэалізацыі тэатральных пастановак на антрэпрызнай аснове (8 рэжысёраў і 32 акцёры).

Аналіз вынікаў даследавання выявіў пэўны сацыяльны партрэт дзеячаў беларускай тэатральнай антрэпрызы. Асноўная маса апытаных рэжысёраў – мужчыны (87,5 %), старэйшыя за 40 год (62,5 %), адукацыю атрымалі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (62,5 %) ці ў Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва (былы ГИТИС) – 37,5 %. Сярод апытаных акцёраў мужчыны складаюць 56,25 %, кожны другі рэспандэнт старэйшы за 40 год, акцёрскую адукацыю атрымалі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (84,4 %), у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (9,4 %).

Вынікі даследавання паказваюць, што ўдзел у пастаноўках спектакляў прыватных тэатраў прыцягвае рэжысёраў магчымасцю рэалізацыі сваіх творчых задум і свабодай выбару акцёрскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складу (87,5 %), а таксама магчымасцю творчага пошуку (50 %) і фарміравання арыгінальнага рэпертуару прыватных тэатраў (25 %). Пры гэтым мае месца значны творчы патэнцыял рэжысёраў антрэпрызы: 25 % апытаных цалкам задаволены сваёй дзейнасцю, а 62,5 % толькі часткова.

Меркаванні пра тое, чым прыцягвае антрэпрыза акцёраў, падзяліліся наступным чынам: супрацоўніцтвам з новым рэжысёрам (75 %), працай з новымі партнёрамі (71,9 %), магчымасцю атрымаць новую ролю (68,75 %), цікавай драматургіяй (65,6 %), творчай атмасферай у калектыве і больш поўнай рэалізацыяй сваіх творчых здольнасцей (62,5 %). Наяўнасць цікавых роляў у антрэпрызе адзначылі 90,6 % апытаных. Да таго ж 59,4 % рэспандэнтаў адзначылі, што ёсць ролі, якія яны мараць сыграць, і 21,9 % бачаць гэтую рэалізацыю менавіта на сцэне прыватнага тэатра. Хаця для 50 % апытаных уласнік тэатральнай пляцоўкі значэння не мае.

Даследаванне паказала, што некаторыя беларускія акцёры дастаткова прагматычна ставяцца да праектаў антрэпрызы. У прыватнасці, 56,2 % апытаных бачаць магчымасць атрымання дадатковага заробку ад удзелу ў прыватных пастаноўках. У той час як ніводны рэжысёр тэатра такой ідэі не выказаў наогул. Затое назіралася поўнае супадзенне меркаванняў майстроў сцэны ў адносінах да гледачоў прыватных тэатраў. І акцёры, і рэжысёры ў роўнай ступені лічаць, што антрэпрыза дазваляе пашырыць іх аўдыторыю за кошт магчымасці фарміравання ў рамках антрэпрызы «свайго гледача». Такога пункту гледжання прытрымліваюцца 37,5 % апытаных акцёраў і столькі ж рэжысёраў.

З іншага боку, пытанне пра тое, чым жа, на погляд сцэнічных дзеячаў, прыцягвае антрэпрыза гледачоў, падзяліла меркаванні адпаведна прафесійнай дзейнасці рэспандэнтаў. Так, рэжысёры лічаць, што антрэпрыза вабіць гледача ў першую чаргу арыгінальнымі рэжысёрскімі працамі (62,5 %), а далей ужо падборам акцёрскага ансамбля, тэматыкай спектакляў ці іх відовішчнасцю (50 %). Па меркаванні акцёраў, антрэпрыза ім цікавая менавіта акцёрскім ансамблем (59,4 %) і эксперыментальным характарам пастановак (56,25 %), а толькі потым арыгінальнай рэжысёрскай задумай (46,9 %).

Дарэчы, менавіта ў адказах рэжысёраў назіраецца больш крытычнае стаўленне да вынікаў сваёй працы. Толькі 37,5 % апытаных рэжысёраў адзначылі факт папулярнасці антрэпрызы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледачоў за кошт эксперыментальнасці пастановак. У акцёраў гэта меркаванне дасягнула 56,25 %. Больш таго, на погляд артыстаў, беларускія спектаклі цікавыя публіцы арыентаванасцю на попыт масавага гледача, у адным выпадку, і элітарную публіку – у другім, прычым меркаванні падзяліліся пароўну: па 21,9 %. Рэжысёры масавую ці элітарную арыентаванасць спектакляў антрэпрызы пакінулі наогул без увагі.

Беларускія акцёры лічаць, што карэнным адрозненнем працы ў дзяржаўным тэатры ад антрэпрызы з'яўляецца свабода выбару, якую дае артыстам антрэпрыза (25 %). З іншага боку, 21,9 % рэспандэнтаў лічаць, што розніцы паміж імі няма. Менавіта таму 25 % апытаных, пры ўмове гарантаванага сацыяльнага пакета, перайшлі б працаваць у прыватны тэатр, а 21,9 % ніколі не пакінуць дзяржаўную службу. У той жа час кожны другі апытаны здавальняюча ацэньвае сваю творчасць у дзяржаўным тэатры, і толькі 25 % акцёраў поўнасцю задаволены сваёй працай.

У пытаннях фарміравання рэпертуару прыватных тэатраў рэжысёры кіруюцца часцей за ўсё актуальнасцю выбіраемай п'есы (50 %), уласнымі сімпатыямі (37,5 %) ці інтуіцыяй. Таму і імідж тэатра напрацоўваецца часцей за ўсё за кошт добрай драматургіі і акцёрскага ансамбля (50 %) або за кошт уласнага бачання (25 %). А найбольш аўтарытэтнымі меркаваннямі пра дзейнасць антрэпрызы для рэжысёраў з'яўляюцца выказванні родных і сяброў (62,5 %), калегаў рэжысёраў і гледачоў (50 %). Чаго, на жаль, нельга сказаць пра СМІ, тэатральных крытыкаў ці нават акцёраў, іх меркаванні (па даных апытання – 12,5 %) для рэжысёраў не з'яўляюцца прыярытэтнымі.

Адзначым, што антрэпрызы не аднойчы з'яўляліся ўдзельнікамі як беларускіх, так і міжнародных фэстаў. Малы тэатр І. Забары браў удзел у Эдынбургскім тэатральным фестывалі, фестывалі «Славянскія сустрэчы» і фестывалі «Балтыйскі дом». Антрэпрыза «Тэатральныя зоркі» брала ўдзел у фестывалі «Маладзечанская сакавіца». Таварыства з дадатковай адказнасцю Новы тэатр удзельнічаў у фестывалі «Лістапад». А антрэпрыза Беларускага фонду развіцця культуры – у тэатральным фестывалі імя А. П. Чэхава, фестывалі «Маладосць веку» і фестывалі «Надзея». У выніку некаторыя творчыя калектывы станавіліся лаўрэатамі (антрэпрыза Беларускага фонду развіцця культуры) ці ўладальнікамі спецыяльных прызоў (антрэпрыза «Тэатральныя зоркі», Новы тэатр ), але і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзнагароджваліся гран-пры (Малы тэатр І. Забары, антрэпрыза Беларускага фонду развіцця культуры, антрэпрыза «Тэатральныя зоркі»).

З іншага боку, на момант правядзення даследавання толькі тры (Новы тэатр, антрэпрыза Беларускага фонду развіцця культуры, тэатр сучаснай драматургіі «Тэатральны каўчэг») з васьмі прадстаўленых тэатраў ажыццяўлялі гастрольную дзейнасць. І прычыны гэтага, як, уласна, і павольнага развіцця ўсёй прыватнай тэатральнай справы ў Беларусі, рэжысёры бачаць у слабаразвітой спонсарскай дзейнасці (75 %), у адсутнасці фінансава даступных сцэнічных пляцовак і адсутнасці належнай увагі да творчасці антрэпрыз з боку дзяржаўных органаў кіравання (62,5 %). Нераспрацаванасць нарматыўна-прававой базы, якая б рэгулявала прыватную тэатральную справу, і несфарміраванае пазітыўнае грамадскае меркаванне пра антрэпрызу адзначылі 37,5 % рэспандэнтаў.

Адсюль і пазіцыі рэжысёраў пра будучыню тэатральнай антрэпрызы падзяліліся на тых, хто бачыць далейшае развіццё беларускага сцэнічнага мастацтва ў рэчышчы прыватнага тэатра (37, 5 %), і тых, хто не верыць у росквіт антрэпрызы (37, 5 %).

Агульныя вынікі праведзенага сацыялагічнага даследавання сведчаць, што тэатральная антрэпрыза заняла сваю нішу ў сацыякультурнай прасторы Беларусі. Нягледзячы на шэраг праблем і складанасцей прававога і фінансавага характару, антрэпрызныя тэатры прывабныя для беларускіх акцёраў і рэжысёраў творчай атмасферай у калектыве і больш поўнай рэалізацыяй творчых здольнасцей. Менавіта магчымасць эксперыментальнай дзейнасці і самавыяўлення прыцягвае ў антрэпрызу дзеячаў сцэны. У той жа час публіку ў прыватныя тэатры, па меркаваннях саміх творцаў, вабяць арыгінальныя пастаноўкі, якія характарызуюцца канцэптуальнасцю рэжысуры, унікальнымі акцёрскімі ансамблямі, відовішчнасцю ўсяго тэатральнага дзейства. Таму майстры сцэны імкнуцца сфарміраваць кола сваіх гледачоў і зрабіць вядомым «твар» свайго тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ